Анализируются различные типы ресурсов территории. Охарактеризован алгоритм формирования турпродукта.

SUMMARY

The article examines preparatory stage of the practice of conceptual design of an ethno-tourist route in modern conditions. Different types of territory resources are analyzed. The tourism product formation algorithm e is characterized.

***Паборцава К. В.***

# ДА ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ПЕРСАНАЖАЎ НІЖЭЙШАЙ МІФАЛОГІІ БЕЛАРУСАЎ (ГІСТАРЫЧНЫ ПЕРЫЯД 1873 – 1912 ГГ.)

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 14.03.2023)*

Як адзначалася ў артыкуле «Вобразы ніжэйшай міфалогіі ў запісах фалькларыстаў ХІХ ст.», апублікаваным у папярэднім выпуску зборніка (вып. 33) «Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі» (Мн., 2023) і прысвечаным гісторыі збірання і вывучэння звестак па міфалагічнай прозе беларусаў, навуковую каштоўнасць маюць матэрыялы «Белорусского сборника» (1912 г., выпуск 8) Е. Р. Раманава для даследавання народных міфапаэтычных уяўленняў. Не менш значнымі ў асэнсаванні светапогляду жыхароў з'яўляюцца і матэрыялы, якія датычацца вобразаў ніжэйшай міфалогіі і змешчаны ў іншым томе гэтага выдання (1891 г., выпуск 4). Напрыклад, варыянты міфалагічных апавяданняў пра русалку ўтрымліваюць каштоўныя звесткі пра яе знешні выгляд. Сцвярджаецца, што гэта страшная жанчына без адзення,

з доўгімі валасамі (*«Бог ведае, што ета за русалкі такія? Кажуць – жэншчыны. Сама голая, страшная, валасы доўгія ў яе – цягнуцца па гоні, і ў яе, кажуць, усё так, як у чалавека, толькі не знашно, ці жэншчына ці музчына – усе раўны»* [1, с. 140]). Пра паходжанне русалкі гаворыцца, што ёю становіцца неданошанае цяжарнай жанчынай дзіця або мёртвае: *«Яны [русалкі], кажуць, з пазвалення сказаць, з скідушаў»*; *«Як баба не даносіць ці так мёртвага родзіць – ета ўжо яна»* [1, с. 217].

Як адзначыла Л. М. Вінаградава, «сярод найбольш паказальных (персанажаўтваральных) прымет русалкі адным з найважнейшых з'яўляецца пытанне аб паходжанні гэтага персанажа, а ў рамках гэтай характарыстыкі – яго генетычная сувязь з душамі памерлых людзей» [2, с. 475].

Заслугоўваюць увагі і іншыя эмпірычныя даныя, што датычаць такіх персанажаў, як чорт, ваўкалак, лазнік, лясун і іншыя.

На старонках зборніка «Гомельскія народныя песні (беларускія і маларускія)», падрыхтаванага З. Ф. Радчанка, змешчаны звесткі пра абрад ваджэння русалкі, прымеркаваны да святкавання Купалля. З этнаграфічнага апісання аўтара вынікае, што выбар дзяўчыны на ролю русалкі цалкам адпавядаў народным уяўленням пра яе іпастась: *«Русалкой выбирают ту, которая имеет самые длинные волосы; она снимает свой андарак и остаётся в одной рубахе, с растёгнутым воротом; когда же русалка посмелее, то сбрасывает даже и рубаху»* [3, с. XXVI].

Карыснымі для асэнсавання эвалюцыі народных уяўленняў пра персанажаў ніжэйшай міфалогіі (напрыклад, ведзьма, ваўкалак) з'яўляюцца працы П. М. Шпілеўскага («Исследование о вовколаках на основании белорусских поверий» // Москвитянин, 1853. Т. 2. № 5; «Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических её

сказках» // Пантеон. – СПб., 1854. № 6), перавыдадзеныя ў 2020 г. («Фольклорное наследие белорусов. Обряды. Поверья»). У нарысе «Чары, заговариванья, суеверья, предрассудки» П. М. Шпілеўскі характарызуе ведзьму, указваючы на вытокі яе ўласцівасцей як дэманічнай істоты, сувязь з нячыстай сілай: «Галоўнымі захавальніцамі чараўніцтва лічыліся жанчыны, і ў пераважнасці жанчыны старыя, выродлівыя, таксама пажылыя дзевы. Народ тлумачыць гэта па-свойму і, можа быць, на якіх-небудзь даных, якія захаваліся ад прадзедаў. Ён думае, што першыя чары і ўсякае чараўніцтва ўзнікла ад жанчыны, якая будучы злоснай на ўсіх мужчын за тое, што ніхто з іх не хацеў звяртаць на яе ўвагі з прычыны яе агіднасці, вырашыла звярнуцца па дапамогу да нячыстай сілы» [4, с. 186]. Аўтар не сумняваецца ў выяўленні гэтай істотай дэманічнай сутнасці: «Ведзьмы і ведзьмары маюць, паводле ўяўленняў народа, непасрэдныя зносіны з нячыстымі духамі» [4, с. 187]. П. М. Шпілеўскі прыводзіць цікавыя звесткі адносна павер’я, звязанага з калодай як прыладай чараўніцтва ведзьмы: «Ніколі не спальваюць той калоды, на якой сякуць дровы, бо лічаць гэтую калоду прыладай чараўніц і ведзьмаў. Калі неасцярожная маці прыспіць сваё дзіця, прычынай гэтага няшчасця лічаць тое, што ведзьмы падклалі гэтую калоду пад ложак» [4, с. 190]. Закранае аўтар і іншыя аспекты, што датычацца ведзьмы: здольнасць ператварацца ў жабу-рапуху і перамяшчацца на тое месца, дзе збіраюцца ведзьмы (Лысую Гару): «Адзін парабак (слуга), заўважыўшы, як старая гаспадыня яго, абмачыўшы сярэдні палец у якую-небудзь вадкасць, ператварылася ў рапуху (жабу) і разам з іншымі падобнымі да яе ведзьмамі збіралася адправіцца на “иготи” ступе на Лысую Гару» [4, с. 188]. Сярод шкодных функцый ведзьмы П. М. Шпілеўскі адзначае адбіранне малака ў кароў: «…адпраўляецца на пашу і ў хлявы і там выдойвае ў кароў малако або

захоплівае цадзілкі (ручнік, праз які працэджваюць свежае малако» [4, с. 187]. Л. М. Вінаградава, прадставіўшы аб'ёмны фактычны матэрыял пра ведзьму, зафіксаваны на тэрыторыі Гомельска-Бранска-Чарнігаўскага памежжа і асэнсаваны ў адпаведнасці з акрэсленай ёй схемай апісання гэтага персанажа («Ведзьма шкодзіць чалавеку і яго гаспадарцы», «Ведзьма выяўляе ўласцівасці дэманічнай істоты», «Дзеянні чалавека ў адносінах да ведзьмы»), падкрэсліла, што матыў адбірання малака ў чужых кароў «з'яўляецца цэнтральным у наборы шкодных функцый ведзьмы і адзначаецца на тэрыторыі Палесся паўсюдна» [5, с. 42]. Звесткі пра ведзьму, запісаныя ў палявых экспедыцыях на тэрыторыі Гомельшчыны студэнтамі і выкладчыкамі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, пацвярджаюць высновы П. М. Шпілеўскага, а таксама тэзіс Л. М. Вінаградавай аб тым, што вышэйназваны матыў (адбіранне малака ў кароў) «выступае ў якасці ідэнтыфікуючай прыметы, гэта значыць, служыць галоўным апазнавальным знакам гэтага персанажа» [5, с. 42].

П. М. Шпілеўскі прывёў цікавыя звесткі пра ваўкалака на старонках працы «Исследование о вовколаках на основании белорусских поверий». Як патрыёт роднага краю, ён падкрэсліваў, што «больш за ўсіх славяна-рускіх і нават, увогуле, славянскіх плямёнаў можа пахваліцца шматлікімі павер'ямі і апавяданнямі пра ваўкалакаў – ваўкалекаў – Беларусь» [4, с. 244 – 245]. Вучоны прапанаваў падзяліць ваўкалакаў на дзве групы: «Па меркаванні беларусцаў, існуе два роды ваўкалакаў. Да першага адносяцца ваўкалакі-знахары, да другога – няшчасныя ахвяры іх, ператвораныя ў ваўкоў: першых беларусцы вельмі баяцца, а другіх шкадуюць» [4, с. 248].

Навуковую каштоўнасць маюць апавяданні пра гэтую істоту, запісаныя з вуснаў інфармантаў. Паводле меркаванняў

П. М. Шпілеўскага, прадстаўленыя апавяданні дапамогуць чытачу зразумець стан ваўкалакаў-ахвяр і ваўкалакаў-знахароў [4, с. 254]. Выяўленыя П. М. Шпілеўскім на аснове фактычнага матэрыялу, запісанага пра ваўкалака ў XIX ст., асноўныя моманты ў апісанні гэтага персанажа, даюць падставы пры параўнанні з сучаснымі запісамі канстатаваць як устойлівасць захавання на працягу пэўнага гістарычнага часу асобных матываў, так і факт страты некаторых іншых. А. Я. Леўкіеўская, характарызуючы ваўкалака, вылучае наступныя моманты ў апісанні гэтага вобраза: «Хто становіцца ваўкалакам», «Спосабы ператварэння чалавека ў ваўка», «Спосабы ператварэння ваўкалака ў чалавека», «Асаблівасці знаходжання чалавека ў воўчым абліччы», «Дзеянні чалавека ў адносінах да ваўкалака» [2, с. 483 – 484].

Звяртае на сябе ўвагу выказванне П. М. Шпілеўскага наконт актыўнасці бытавання народных павер'яў пра ваўкалака ў XIX ст.: «А сучасныя паданні беларусцаў пра ваўкалакаў вельмі-вельмі разнастайныя і багатыя. Няма наваколля, няма вёскі, няма сям'і, дзе б не ведалі якога-небудзь самага пацешнага апавядання, самага фантастычнага павер'я пра ваўкалакаў» [4, с. 247]. Сёння ў народнай памяці захаваліся невялікія звесткі пра дадзены вобраз народнай дэманалогіі. У сувязі з гэтым тагачаснае даследаванне аб ваўкалаках, праведзенае П. М. Шпілеўскім на аснове народных павер'яў, не губляе актуальнасці, а выяўленыя аўтарам на аснове аналізу фактычнага матэрыялу асобныя аспекты, звязаныя з гэтым міфалагічным персанажам, даюць магчымасць больш глыбока асэнсаваць матывы прымхліц. Выяўленыя А. Я. Леўкіеўскай на агульнапалескім матэрыяле матывы апавяданняў пра ваўкалака маюць месца і ў сучасных запісах звестак пра гэтую істоту, якая адрозніваецца такімі адметнымі рысамі, як наяўнасць чалавечага погляду, акустычныя асаблівасці голасу,

адметнасці харчавання [6, с. 46 – 47]. Закранутыя П. М. Шпілеўскім асобныя аспекты даследавання вобраза ваўкалака (сувязь персанажа з нячыстай сілай, драпежны характар ваўкалакаў-знахароў і захаванне ў пэўнай ступені чалавечых пачуццяў ваўкалакамі-ахвярамі) надзвычай важныя для асэнсавання матываў паходжання дадзенай міфалагічнай істоты, свядомага ператварэння ў ваўкалака, калі злосныя па натуры знахар або ведзьма становяцца воўкам, і гвалтоўнага абарачэння чалавека ведзьмай або знахаром у ваўкалака. Прыведзеныя даследчыкам апавяданні пра ваўкалакаў з мэтай падмацавання сваіх разваг пра гэтых персанажаў ніжэйшай міфалогіі, як адзначыў сам аўтар, даюць магчымасць сфарміраваць дакладныя ўяўленні «як пра сілу ваўкалакаў-знахароў і знахарак беларускіх, так і пра бядотны стан няшчасных іх ахвяр» [4, с. 261].

Нельга пакінуць па-за ўвагай працу А. К. Кіркора «Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3, ч. 2. Белорусское Полесье», у якой таксама змешчаны карысныя звесткі пра персанажаў ніжэйшай міфалогіі, у прыватнасці пра лесуна, ведзьму, русалку і іншых. Як адзначыла А. Я. Леўкіеўская, на тэрыторыі Палесся «ўяўленні пра ляснога персанажа развіты слаба і ў асноўным вядомы ў беларускай частцы рэгіёна. Самі тэксты пра ляснога духа нешматлікія і кароткія, а звесткі, якія ў іх змяшчаюцца, скупыя і часта зводзяцца да згадвання імя персанажа і яго асноўных дзеянняў» [7, с. 337]. У кантэксце прыведзенага выказвання менавіта надзвычай важнымі з’яўляюцца матэрыялы пра гэты персанаж, прадстаўленыя А. К. Кіркорам. Асноўныя матывы міфалагічных апавяданняў пра лесуна, як адзначае А. Я. Леўкіеўская, наступныя: «Персанажы, якія існуюць у лесе», «Знешні выгляд ляснога духа», «Функцыі ляснога духа, скіраваныя на

чалавека», «Функцыі ляснога духа, не скіраваныя на чалавека», «Адносіны чалавека да ляснога духа» [7, с. 339]. А. К. Кіркор у раздзеле «Сляды язычніцтва ў святах, абрадах і песнях» ахарактарызаваў такіх персанажаў, як лясун, ведзьма, русалка і іншыя. Напрыклад, у апісаннях аўтарам лесуна адлюстраваны асобныя вышэйназваныя матывы, звязаныя са знешнім выглядам персанажа («Лясун (лешы) ростам роўны з самымі высокімі дубамі і іншымі дрэвамі, але калі з'явіцца на паляне, ён роўны з травою» [8, с. 271]), з яго функцыяй збіваць чалавека з дарогі («… прымушае блукаць, давядзе да роспачы і тады рагоча, як шалёны» [8, с. 271]).

Выклікаюць цікавасць і звесткі пра чараўніцу (ведзьму), прыведзеныя А. К. Кіркорам: «Чараўніцы ў гэтую ноч таксама выкідваюць розныя штукі: пояць кароў расой і гэтым адбіраюць у іх малако» [8, с. 265]. У сучасных запісах звестак пра ведзьму ўстойлівым з'яўляецца матыў засцярогі свойскай жывёлы ад яе звышнатуральнага ўздзеяння, пра які прыгадвае даследчык: «…заўважыўшы, што карова менш звычайнага дае малака, гаспадыня бярэ цадзілку і варыць яе ў гаршку са святаянскім зеллем. Ад гэтага чараўніца адразу захварэе і сама прыйдзе да яе прасіць чаго-небудзь у пазыку» [8, с. 265].

Разгледжаныя ў працах фалькларыстаў-збіральнікаў XIX ст. (Е. Р. Раманаў, З. Ф. Радчанка, П. М. Шпілеўскі, А. К. Кіркор) звесткі пра асобных персанажаў ніжэйшай міфалогіі дазваляюць зрабіць высновы аб навуковай каштоўнасці фальклорна-міфалагічных матэрыялаў для даследавання сучаснага стану бытавання, захавання ў народнай памяці, трансфармацыі з'яў традыцыйнай культуры беларусаў, у прыватнасці міфалагічнай прозы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Романов, Е. Р. Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Витебск : Типо-литография Г. А. Малкина, 1891. – Вып. 4. Сказки космогонические и культурные. – 220 с.
2. Народная демонология Полесья: публикация текстов в записях 80 – 90-х гг. XX века. / сост. Л. Н. Виноградова, Е. Е. Левкиевская. – М. : Рукописные памятники Древней Руси, 2012. – Т. 2. Демонологизация умерших людей. – 800 с.
3. Радченко, З. Гомельские народные песни (белорусские и малорусские) / З. Радченко. – СПб. : Тип. В. Безобразова, 1888. – XLIII, 265 с.
4. Шпилевский, П. М. Фольклорное наследие белорусов. Обряды. Поверья / П.М. Шпилевский ; сост., авт. предисл. А. Ващенко. – Минск : Беларусь, 2020. – 343 с.
5. Народная демонология Полесья: публикация текстов в записях 80 – 90-х гг. XX века / сост. Л. Н. Виноградова, Е. Е. Левкиевская. – М. : Языки славянских культур, 2010. – Т. 1. Люди со сверхъестественными свойствами. – 648 с.
6. Беларуская міфалогія : хрэстаматыя / уклад. В. С. Новак. – Мінск : РІВШ, 2013. – 394 с.
7. Народная демонология Полесья: публикация текстов в записях 80 – 90-х гг. XX века / сост. Л. Н. Виноградова, Е. Е. Левкиевская. – М. : Изд. дом ЯСК, 2020. – Т. 4. Духи домашнего и природного пространства. Нелокализованные персонажи. – 832 с.
8. Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье. – Минск : БелЭн, 1993. – 550 с.


## РЕЗЮМЕ


В статье проанализированы работы фольклористов-собирателей XIX в., в которых нашла отражение информация о персонажах низшей мифологии. Особое внимание сосредоточено на трудах Е. Р. Романова, З. Ф. Радченко, П. М. Шпилевского, А. К. Киркора и других, в которых характеризуются демонологические образы. Автор статьи подчёркивает ценность для современных исследований мифологической прозы белорусов приведённых сведений по образам народной демонологии и связанных с ними народных верований.

SUMMARY

The article analyzes the works of folklorists of the 19th century, in which they reflected the information about the characters of lower mythology. Special attention is focused on the works of E. R. Romanov, Z. F. Radchenko, P. M. Shpilevsky, A. K. Kirkor and others, which characterize demonological images. The author of the article emphasizes the value of Belorussian mythological prose about the images of folk demonology and related folk beliefs for modern research.

***Селях А. А.***

# БАЎЛЕННЕ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЙ МОЛАДДЗЮ Ў 2-Й ПАЛОВЕ 1940-Х – 1980-Я ГАДЫ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 13.03.2023)*

Гісторыя штодзённасці ўключае розныя аспекты жыццядзейнасці чалавека. Адной з неад’емных «структур» чалавечага жыцця з’уляюцца забаўляльныя практыкі. Формы баўлення вольнага часу моладзі ў беларускай этналагічнай навуцы разглядаліся даследчыкамі з улікам рэгіянальнай спецыфікі. У публікацыях І. Ю. Смірновай даследавалася спецыфіка маладзёжных вячорак на Міншчыне, Гомельшчыне, Брэстчыне [1 – 4]. Артыкулы А. Б. Захарэвіч прысвечаны вывучэнню формаў баўлення вольнага часу моладзі на тэрыторыі Падзвіння [5; 6]. Традыцыі моладзевых зносін на тэрыторыі Брэсцкага Палесся вывучала А. А. Гугнюк (Селях) [7 – 9]. Адметнасцю прац з’яўляецца выкарыстанне матэрыялаў з асабістых палявых даследаванняў аўтараў, што дазваляе больш поўна, праз прызму прыватнага жыцця жыхароў